Анастасія КАЦЮРГІНА

ПАЭМЫ-ПАЛІНДРОМЫ Ў ПАЭЗІІ ЖЫБУЛЯ

У літаратуразнаўстве паэма разам з баладай і байкай традыцыйна разглядаецца як адна з ліра-эпічных форм. Пры адноснай устойлівасці гэтага жанру заўважныя зрухі, мадыфікацыі паэмы асабліва прыкметна выявілі сябе ў пачатку — першай трэці ХХ стагоддзя (паэмы Янкі Купалы, Уладзіміра Дубоўкі). Трэба сказаць, што дадзены зменлівы працэс, а ён найбольш адчувальны на сучасным этапе развіцця айчыннай літаратуры, ніколі не адрозніваўся раўнамернасцю, тым самым часта выклікаючы неадназначныя ацэнкі яго навукоўцамі.

Т. Чабан пісала: «…склалася ўражанне, што апошнімі беларускімі паэмамі былі «Хамуціус» А. Куляшова і «Маўчанне травы» В. Зуёнка. А потым — дзесяцігоддзе «маўчання» паэмы, своеасаблівы крызіс жанру» [1, с. 191]. Такое крыху песімістычнае меркаванне ўдумлівай даследчыцы пра становішча і перспектывы развіцця жанру паэмы ў 70—80-я гады мінулага стагоддзя можа быць патлумачана словамі стваральніка і знаўцы ліра-эпасу М. Арочкі: «Атавізмам стаў не эпас сам па сабе, а традыцыйна састарэлае ўяўленне пра яго абавязковую жанравую прыроду» [2, с. 80]. Між тым жывая літаратурная практыка брала сваё. І працэс эвалюцыянавання буйнога ліра-эпічнага жанру станавіўся відавочным: «сучасны перыяд беларускай паэзіі паступова рабіўся ўсё больш паэмным, спрыяльным для вершаванай эпікі» [3, с. 246].

Спробы эксперыментатарства з жанрам паэмы, з яе зместам і формай у сучасным прыгожым пісьменстве скіравалі аўтараў да стварэння цікавых мадыфікацый. Так, вынікам жанрава-фармальных пошукаў Р. Барадуліна стала паэма «Слухаючы мора», жанравую спецыфіку якой аўтар вызначыў як «хваля-паэма»; яго ж «Смаргонская акадэмія» пазначана як «наравістая паэма».

Арыгінальнай падаецца жанравая спецыфіка паэм А. Разанава. А. Бельскі характарызуе творы пісьменніка як «свайго роду эксперыментальныя формы, для якіх аўтар яшчэ не шукае спецыяльнай жанравай пазнакі, але пэўнае канцэптуальнае аб'яднанне робіцца праз загаловак: «Паэма» плюс назоўнік у родным склоне» [4, с. 49]. Гаворка ідзе пра такія творы пісьменніка, як: «Паэма сланечніка», «Паэма рэха», іншыя.

Актыўныя пошукі ў жанры паэмы назіраюцца і ў творчасці прадстаўнікоў маладзейшага пакалення. Аўтар некалькіх зборнікаў вершаў, паэт, бард, а сёння яшчэ і галоўны рэдактар часопіса «Верасень» Э. Акулін жанр свайго твора «Шлях да Радзімы» вызначыў як акрапаэма. Удалай спробай стварыць адметную жанравую ліра-эпічную адзінку можна лічыць паэму ў манавершах «Такі час» літаратурнага крытыка і пісьменніцы А. Бязлепкінай. Што датычыцца аднаго з самых яркіх эксперыментатараў у айчыннай паэзіі апошняга часу В. Жыбуля, то ён звярнуўся да напісання сінтэзаванай формы паэмы — паэмы-паліндрома. Гэты жанр у мастацкай сістэме аўтара прадстаўляюць паэмы «Рогі гор», «Кацёл клёцак», «Палігон ног і лап».

У дадзеных творах даследчыкамі былі знойдзены прыкметы транслагізму. Даследчыцай А. Брадзіхінай даецца наступнае азначэнне гэтай эстэтычнай з'явы: «На думку стваральнікаў транслагізму С. Мінскевіча і А. Туровіча, гэта літаратурна-мастацкі метад, які «стварае (сэнсавыя, пачуццёвыя, абстрактныя...) лабірынты пранікнення скрозь бясконцамерны тунэльны тэкстасвет, дзе тунэлі безупынна то адчыня-

юцца, то зачыняюцца; спалучае асацыяцыямі розныя ўзроўні звышматэрыяльнасці». Так, усялякі збег літар абавязкова мае некалькі сэнсаў — калі не ў роднай, дык у іншых мовах. На гэтай падставе можна злучыць паміж сабой усе тэксты і мовы, што існуюць у свеце. У адрозненне ад фанетыка-асацыятыўнага пісьма, …мы маем справу не з моўным нігілізмам, а яго антыподам — моўным абсалютызмам. Большасць транслагічных тэкстаў па сваёй сутнасці з'яўляюцца паліндромамі, каламбурамі, шарадамі, анаграмамі ці творамі, зашыфраванымі іншымі спосабамі» [5, с. 131].

І ўсё ж нельга не пагадзіцца з тым, што так званыя транслагічныя тэксты — «гэта тэксты-патрыёты». «Замежніку, каб зразумець іх, трэба перакласці самога сябе ў семантычную прастору беларускай культуры» [5, с. 131], — адзначае Ю. Барысевіч. Віктар Жыбуль, асэнсоўваючы мэтазгоднасць напісання такога віду транслагічных твораў, як паліндром, піша: «На маю думку, магчымасць стварэння паліндромаў на пэўнай мове сведчыць аб пластычнасці гэтай мовы, яе графічнай і фанетычнай выразнасці, яе семантычных сродках» [5, с. 3].

У навуковай літаратуры сустракаюцца розныя дэфініцыі тэрміна «паліндром». У літаратуразнаўстве распаўсюджана даволі вузкае тлумачэнне дадзенага паняцця: «Паліндром, паліндрамон (palirn — 'назад', dromo — 'бег'; гэта значыць 'той, які бяжыць назад, вяртаецца', з грэч.) — фраза або верш, якія могуць чытацца (па літарах або па словах) спераду назад і ззаду наперад, пры гэтым захаваецца здавальняючы сэнс» [6, с. 536]. В. Рагойша падае такое тлумачэнне: «Паліндром (ад грэч. palindromos — які вяртаецца), пярэварацень, — літаратурны твор, радкі якога прачытваюцца не толькі злева направа, але і справа налева, захоўваючы той самы сэнс. Засноўваецца на паліндрамічных магчымасцях асобных слоў (*тут, боб*) ці выразаў (*бурт труб; Аліса касіла, а Ліза вазіла*)» [7, с. 167].

Варта ўдакладніць, што паліндром вядомы са старажытнасці і першапачаткова валодаў містычным арэолам (недзе да XIX стагоддзя). Пераломным момантам у асэнсаванні паліндрома стала з'яўленне ў рускай літаратуры «Перевертня» і «Разина» (В. Хлебнікаў). У беларускай літаратуры да паліндромнага верша першым звярнуўся С. Полацкі. Вядомы ягоны верш «Рак», напісаны на лацінскай мове. Пасля, амаль на працягу некалькіх стагоддзяў, да паліндромаў айчынныя аўтары не звярталіся. У XX стагоддзі вершы-паліндромы ствараў паэт-эмігрант Р. Крушына. Першым беларускамоўным паліндромам ў беларускай літаратуры лічыцца якраз яго твор «Я і лаза».

Даследчыкі адзначаюць, што працэс напісання якаснага вершаванага паліндрома патрабуе ад аўтара наяўнасці літаратурнага таленту, дасканалага валодання мовай і выключнага ведання яе фанетычнага ладу. Таму лічым мэтазгодным прааналізаваць паэмы-паліндромы Віктара Жыбуля на ўзроўні іх мовы і структурнай арганізацыі тэкстаў.

Паэмы-паліндромы Віктара Жыбуля «Рогі гор» (1996) і «Палігон ног і лап» (2001) даюць унікальны па аб'ёме матэрыял для аналізу. Так, тэкст першага з названых твораў складаецца з 242 аднарадковых паліндромаў. Наогул жа паэмы з'яўляюцца шматрадковымі паліндромамі. Частотнасць напісання беларускімі аўтарамі рыфмаваных паліндромаў невялікая. У тэксце паэмы «Рогі гор» сустракаюцца 26 пар рыфмаў, большасць з якіх мужчынскія, з націскам на апошнім складзе, недакладныя (*рагу — лукум, ката — матам, гоман — ран*). «Рогі гор» — першая беларуская паэма-паліндром, якая прынесла аўтару прызнанне і атрымала станоўчыя водгукі крытыкаў і літаратараў. Па словах Г. Кісліцынай, гэты твор Жыбуля — «беспрэцэдэнтны выпадак у гісторыі беларускай літаратуры, хоць падобныя творы ствараліся й раней, напрыклад Р. Крушынам. Паэма «Рогі гор» — не проста філалагічнае вышуканства ў эпоху панавання свабоднага верша, а й цвяроза-іранічны погляд на свет, паэтычны «дыягназ» рэчаіснасці. «Рогі гор» можна разглядаць як індывідуальны вынік калектыўных пошукаў нацыянальных гукасэнсаў і інтэрнацыянальных рытмавобразаў, якімі сёння захоплена амаль уся маладая паэзія» [8, с. 157].

У паэме «Палігон ног і лап» рыфмы пераважна дакладныя, мужчынскія і жано-

чыя (*асоба — жалоба, газ — раз, удар — жандар).* Заўважана выкарыстанне аўтарам гульнёвай паэтыкі. Напрыклад, у тэкстах сустракаюцца анаграмныя пары (*Саня Янасін — Сеня Янесін, каму — кум, кошт — шок)*, якія натуральна глядзяцца ў асобных паліндромах, таму што з'яўляюцца адной з рыс «пярэваратня». Але ў тэксце паэм анаграмныя пары знаходзяцца ў асобных паліндромах (*«**Ага**, логава голага! / Ага, **нага** пана паганага!»* [9, с. 52]).

Мова паэм схіляецца да лапідарнасці. Часта ў ёй пераважаюць кароткія лексіка-граматычныя формы (*«Рогі гор. / Рухі віхур. / Лёсы сёл…»* [10, с. 52]; «*Тут / або сам — асоба, / або — лажа, жалоба!»* [9, с. 43]), што з'яўляецца адной з характэрных асаблівасцей беларускага паліндрома. Своеасаблівым цэнтрам паліндромнай лапідарнасці з'яўляецца наяўнасць 4-5 гукаў у словаформе. Згодна з «законам абсарбацыі», прапанаваным рускім даследчыкам А. Бубновым [11, с. 63], з моўнай плыні выбіраюцца асобныя патрэбныя словаформы, якія звужаюць патэнцыяльныя магчымасці мовы пры перадачы аўтарскай думкі. Таму аўтар не пазбягае іншасказальнасці, ускладненай метафарызацыі мовы і сэнсавага боку твора, тэкст якога патрабуе «дэшыфроўкі»: (*«А пах / рамонкаў — акно мар — / закапаў…* [10, с. 57]; *Рогі гор — / гора дарог»* [10, с. 52]; *«О, бура ног, / курава — ліха пах, і лава рук!»* [9, с. 43]; *«Тэмп мэт! / Ура. буру бару!»* [9, с. 43]). Гэта абумоўлівае постмадэрнісцкую шматузроўневасць зместавай арганізацыі тэксту. Таксама адным з выдаткаў звужанасці выбару лексем і словаформ пры напісанні паліндромаў з'яўляецца «ламаны» вершаваны памер, які заўважны ва ўсіх тэкстах такога характару. Не выключэннем з'яўляюцца і паэмы Віктара Жыбуля.

Паліндромная кампазіцыя характарызуецца гукавой сіметрыяй і выпадкамі асіметрыі на розных узроўнях арганізацыі тэксту. Кампазіцыю паэм «Рогі гор» і «Палігон ног і лап» характарызуе літарная і гукавая сіметрычнасць (*«Атака ката / матам*» [10, с. 54]; *«Рогі гор»* [10, с. 52]), што дадае твору эстэтычнай вартасці. Разам з тым назіраюцца выпадкі асіметрыі ў выніку аглушэння зычных на канцы слова (*«Дом мод…»* [10, с. 59]; *«закапаў… А паказ»* [10, с. 57]), перастаноўкі націску (*«А ламачча мала»* [10, с. 53]; *«А во — дуба дала дабудова!»* [10, с. 53]; *«Атака драмала. Валіла валам арда ката»* [9, с. 43]; *«Мы жуду дужым»* [9, с. 43]). Асіметрыя абумоўлена абраным В. Жыбулем прынцыпам напісання паліндрома і адбору лексікі, згодна з якім словы ў адваротным парадку чытаюцца не па гуках, а па літарах. Трэба адзначыць, што «сіметрыя ў паліндроме вельмі нестабільная і не падпарадкоўваецца строгім законам. Кожны з аўтараў з улікам задач свайго сачынення сам для сябе вызначае такую ступень, прычым гэта адбываецца не непасрэдна, а апасродкавана праз вызначэнне аўтарам паняцця паліндрома» [11, с. 69]. Паэма «Рогі гор» і «Палігон ног і лап» — літарныя паліндромы, чым і абумоўлены выпадкі гукавой асіметрыі.

Паліндрамічная паэма «Палігон ног і лап» пазнейшая па часе напісання, таму мэтазгодна вызначыць яе адрозныя рысы ў параўнанні з першым ліра-эпічным творам пісьменніка «Рогі гор». Зрэшты, у шматлікіх інтэрв'ю сам аўтар прызнае паэму вучнёўскай, паколькі матэрыял, які склаў «Рогі гор», збіраўся не метадычна выверана. Часам гэта былі асобныя словы і сказы, што пры напісанні твора «кіравалі» яго сюжэтам і ідэяй. Гэта найбольш паэма-роздум, сюжэт у ёй цьмяны. Нярэдка ў тэксце «падзейную» лінію перабіваюць «стыхійныя» разважанні.

«Палігон ног і лап» — твор з лагічна выбудаваным сюжэтным і дынамічным, адпаведным тэме, дзеяннем. У адрозненне ад паэмы «Рогі гор», ён складаецца з большай колькасці монапаліндромаў. Назіраецца ўзбагачэнне слоўнікавага запасу паэта-паліндраміста. Аўтар пазбягае немэтазгодных паўтораў словаформ, якія нярэдка перагружаюць сэнсавы бок паэмы. У тэксце паліндрома сустракаюцца ўласныя імёны, што ў натуральнай моўнай плыні не валодаюць здольнасцю чытацца аднолькава злева направа і справа налева. Але яны даволі ўдала ўжыты ў творы, што паказвае на ўзрастаючы прафесіяналізм

паліндраміста, яго выключнае валоданне мовай.

У творы заўважна ўяўная прысутнасць аўтара-саўдзельніка, які нярэдка звяртаецца да чытача (*«А гаду — самасуд, ага?»* [9, с. 43]; *«Розуму каму мінімум?»* [9, с. 43]), выяўляе сябе праз устаўныя канструкцыі, што ўказваюць на адпаведны эмацыянальны стан лірычнага героя (*«— От (хі!) ніхто / не здадзен / на ратны чын»* [9, с. 43]; *«Раз — / і няма! (Панна, памяні!)»* [9, с. 43] і інш.).

Нельга не заўважыць, як прыкметна ў Віктара Жыбуля ад твора да твора ўзмацняецца эпічны пачатак. Лірычны герой бярэ на сябе функцыю наратара. Іншы раз мова абцяжарваецца клічнымі сказамі, у сувязі з чым губляецца эфект «эмацыйнага выбуху» (*«Удар канакраду! / І багатага бі, / Ездавы! Разані, міна зарыва! / Дзе гонар? У бой!»* [9, с. 43]; *«Такім — і хімікат, / і лук! Кулі / авал — о, волава!»* [9, с. 43]).

Ліра-эпас аўтара характарызуе тэматычнае і ідэйнае багацце. Віктар Жыбуль аднолькава захапляльна распавядае, напрыклад, пра вайну і пра ежу. Да прыкладу, пацверджаннем таму, што творы «Палігон лап і ног» і «Кацёл клёцак» з'яўляецца паэмамі, выступае наяўнасць у іх сюжэтных ліній і кампазіцыі, вобраза лірычнага героя і персанажаў, рознага кшталту адступленняў.

Відавочна, што дзякуючы названым паэмам Жыбуля («Рогі гор», «Палігон ног і лап», «Кацёл клёцак» і іншым) гэты жанр засведчыў новыя структурныя і зместавыя магчымасці, адкрыў шматсэнсавасць, тэкставыя і падтэкставыя глыбіні і ўжо тым самым забяспечыў сваё заслужанае высокае месца ў айчынным вершаскладанні. Паліндром стаў адметным спосабам выказвання і паказу зваротнасці, абарачальнасці падзей, з'яў у часе і прасторы. Паступова гэтая складаная мастацкая форма атрымлівае больш шырокае распаўсюджванне, умацоўваецца ў літаратурнай практыцы. Ствараюцца нерыфмаваныя і рыфмаваныя паліндромныя вершы, паэмы, драматычныя творы, невялікія апавяданні. І ўсё ж відавочна, што эвалюцыя паліндрома ў беларускай літаратуры яшчэ чакае свайго росквіту, аднолькава як і глыбокага даследавання.

ЛІТАРАТУРА:

1. Чабан, Т. Мара пра эпас / Т. Чабан // Полымя. — 1990 — № 4. — С. 194—200.
2. Арочка, М. Паэзія / М. Арочка, П. Дзюбайла, С. Лаўшук. На парозе 90-х: Літ. агляд. — Мінск, 1993. — С. 225—248
3. Бельскі, А. Вывучэнне творчасці пісьменнікаў: класікі і сучаснікі ў школе / А. Бельскі. — Мінск, 2005. — С. 325
4. Жыбуль, В. Што такое паліндромы? / Настаўніцкая газета. — 1997. — 5 лютага.
5. Брадзіхіна, А. В. Зместава-фармальныя пошукі сучаснай беларускай лірыкі: курс лекцый па спецкурсе для студэнтаў філалагічных спецыяльнасцей вну / А. В. Брадзіхіна; М-ва адук. РБ, Гомельскі дзяржаўны універсітэт імя Ф. Скарыны. — Гомель : ГДУ імя Ф. Скарыны, 2006. — 140 с.
6. Гаспаров, М. Л. Краткая литературная энциклопедия / М. Л. Гаспаров. — М.: Советская энциклопедия, 1968. — 655 с.
7. Рагойша, В. П. Літаратуразнаўчы слоўнік: тэрміны і паняцці: для школьнікаў і абітурыентаў / В. П. Рагойша. — Мінск.: Нар. асвета, 2009. — 303 с.
8. Кісліцына, Г. М. Новая літаратурная сітуацыя: змена культурнай парадыгмы / Ганна Кісліцына. — Мн.: Логвінаў, 2006. — 205, [2] с. — (Другі фронт мастацтваў).
9. Жыбуль, В. Палігон ног і лап: Урыўкі з паліндромнай паэмы / В. Жыбуль // Першацвет. — 2001. — № 11. — с. 40—43
10. Тазік беларускі: Зб. вершаў / В В. Акудовіч, З. М. Вішнёў і інш.: — Мн.: «Бервіта», 1998. — 96 с.: іл.
11. Бубнов, А.В. Палиндромия: Самая объемная книга о русском палиндроме / А. В. Бубнов. — Курск: «Борей-арт», 1998. — 272 с.

Гомельскі сшытак